Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

**Святлана ДЗЯНІСАВА, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»**

# ЖАНЧЫНА-ТАЯМНІЦА



Больш за дзесяць гадоў прайшло з той пары, а забыць не атрымліваецца. Хоць гэта той выпадак, якіх процьма штодня здараецца і штодня забываецца, выцясняючыся з памяці іншымі, наступнымі выпадкамі. Гэты выпадак шарагова-канвеерны, я б так сказала, а не нейкі там... Не нейкі такі, што нельга яго забыць. Таму і дзіўна. Быццам чартаўшчына нейкая: размову, у якой я нават і не ўдзельнічала, а была толькі сведкай, якая мяне не датычылася, а проста канстатавала ўражальны для мяне факт, я ўсё яшчэ ўспамінаю. Вельмі часта. Невытлумачальна часта і без аніякіх нагод. Чаму? Пра тое вось і размова...

Сказаць, што мяне тыя словы неяк зачапілі, пакрыўдзілі? Ды не. Яны мяне абурылі — вось чыстая праўда. Ну, яшчэ выклікалі пэўную колькасць нейкага падабенства агіды да жанчыні, якая іх прамаўляла. Гэта прытым, што я вельмі люблю людзей, ніколі на іх не крыўдую, заўсёды ўсіх апраўдваю, усё ўсім прабачаю. Мяне можна прыкладаць да раны, як часам кажуць. Агіда ж ад той размовы застаецца дагэтуль, разам з памяццю пра яе. Чаму?

Цалкам верагодна, што я сапраўды пакрыўджана. На яе, тую жанчынку. Але не сама, а замест іх, на якіх яна, так бы мовіць, месцы. Моляцца ж за тых, хто ніколі не моліцца. Вось і я крыўдую за тых, каму за сябе не крыўдна. Так, напэўна, і ёсць: мне крыўдна за сваю былую супрацоўніцу і яшчэ процьму такіх самых, як яна.

Размова ішла пра вязанне кручком. Калянка распавядала, як паклала ў шпіталь сваю маці, і як яны абедзьве ўбачылі там «фантастычнае відовішча»: матчына суседка па палаце («Маладая ж яшчэ жанчына!») вязала карункі! Не з захапленнем тое было прамоўлена, хоць, па логіцы, якое яшчэ пачуццё можа выклікаць жанчына (любога ўзросту) з чароўнай палачкай у руках? З палачкай, якая ператварае роўную гладкую нітку ў казачныя ўзоры? Пяшчота і замілаванне найбольш адпавядалі б сітуацыі, але мая знаёмая акрэсліла яе інача: «Я спытала ў маці: «Мо і табе купіць кручок і ніткі? Будзеш таксама, як баба старая, вязаць», а маці кажа: «Не, я да такога яшчэ не дайшла». І меўся на ўвазе не толькі ўзрост. Сказанае сведчыла — і словам, і тонам — пра грэблівасць да такога занятку і непавагу да жанчын, якія аддаюць яму свой вольны час.

Інакш кажучы, мне трэба было ціхенька маўчаць, што і я вяжу кручком, раблю гэта з ранняга дзяцінства, дагэтуль гублю прытомнасць у прысутнасці карункаў ручной работы і лічу іх падставай для гонару. Я і маўчала. Толькі не з той прычыны. Проста не палічыла патрэбным нешта тут каментаваць.

...Ёсць жанчыны, якія назаўсёды застануцца для мяне таямніцамі. Назіраю за імі — і дзіву даваца не перастаю. Дзеці іх (нешматлікія, хутчэй адно) ужо выраслі, ад дома адышлі, хоць сям'ю сабе не прыдбалі (што таксама пра нешта ды сведчыць), таму ні сабою, ні ўнукамі не турбуюць. Падаконнікі ў кватэрах гэтых жанчын кветкамі не застаўлены і часу, знаць, таксама не забіраюць. Як не забірае яго гатаванне ежы: такія жанчыны і рэцэптамі не цікавяцца, і шафкі ў кухні формамі для выпечкі не абцяжараны. Яны, таксама заўважана, па тэатрах і музеях не ходзяць, багемны лад жыцця не вядуць. І не з'яўляюцца працагалічкамі: на працы да ночы не прападаюць, а так — абы дзень да вечара. І вось што яны робяць, прыйшоўшы дамоў?! Таямніца, якую не разгадаць!

■ Паміж намі

# НУ, НЕ АПАЛОН...



Вось так заўсёды. Калі ты ні з кім не хочаш размаўляць, з табой чамусьці хочуць усе. Разгар працоўнага дня, чарговы тэлефонны званок... Здымаю трубку і чую:

— Выходзь за мяне замуж!

Ну канешне, як я магла забыць? Пасля апошняй зробленай падобным чынам прапановы прайшоў амаль што год. Усяго іх (прапаноў) было, здаецца, пяць. Без уліку сённяшняй, зразумела.

— Не магу.

— Чаму?

— Таму што, па-першае, я цябе не кахаю. А па-другое, у мяне ўжо ёсць муж, і ты пра гэта цудоўна ведаеш.

— Ведаю. Пашанцавала ж мярзотніку!

— Чаму мярзотніку?

— Таму што гэта не я.

...Колькі гадоў мы паўтараем гэту бессэнсоўную размову.

— Калі я магу патэлефанаваць табе зноў?

— Праз год.

— У мяне з'явіцца шанц?

— Надзея памірае апошняй, — адказваю я і кладу трубку.

Трэба ж быць такім настырным! Хаця... Хіба раней ён павадзіў сябе інакш?

...СТАЯЎ не па-асенняму цёплы верасень. Народ па вечарах высыпаў на вуліцу ў шортах і майках, а на кожным рагу цалаваліся закаханыя парачкі.

На задняй пляцоўцы аўтобуса было малалюдна. Я павярнулася спінай да праходу і ўставілася ў акно. Праз пару хвілін увагу прыцягнуў дзіўны аб'ект — чорны «фольксваген».

У самім аб'екце, праўда, нічога незвычайнага не было. Дзіўным падалося тое, што «фольксваген» увесь час ехаў непасрэдна за аўтобусам, паўтараючы яго маршрут і прытармажваючы на прыпынках. Раптам аўто мігнула фарамі. Потым яшчэ і яшчэ раз...

На прыпынку я выйшла, краем вока заўважыўшы чорны аўтамабіль, у якім ужо адчыняліся дзверкі.

— Вы заўсёды імкнецеся збегчы ад лёсу?

Ён дагнаў мяне і пайшоў побач. «На маньяка не падобны», — падумала я з палёгкай. Аднак да Алена Дэлона майму спадарожніку таксама было далёка. Невысокі, грузнаваты, лысаваты, з жывоцікам... Пасля вымушанай прабежкі яго твар пачырванеў і пакрыўся кропелькамі поту. Мужчына папрасіў прабачэння, дастаў насоўку і пачаў выціраць твар... Я пашкадавала яго і збавіла хуткасць.

Ён быў роўна на дваццаць пяць гадоў старэйшы за мяне. І імя такое старамоднае — Міраслаў.

— Я ні на што не прэтэндую, — сказаў сур'ёзна. — Проста мне хацелася б, каб мы хоць зрэдку бачыліся.

— А як жа ваша жонка? — пацікавілася я проста так.

— Мы разышліся тры гады таму. Яна пайшла да іншага мужчыны, дзеці жывуць асобна. Так што я — зайздросны халасцяк з жылплошчай.

Я паглядзела на яго са шкадаваннем, падумаўшы, што ні кватэра, ні іншыя атрыбуты не дапамогуць яму дабіцца пастаўленай мэты. Праўда, адчуваць яўную сімпатыю і нават захапленне з боку мужчыны, які тое-сёе пабачыў у жыцці, было ўсё ж прыемна. І калі ён дастаў сваю візітную картку, я, доўга не думаючы, узяла яе і паклала ў сумачку, у патайную кішэньку.

Урэшце, што я страчвала? Муж ужо цэлы год круціў раман з дваццацігадовай студэнткай, не надта абцяжарваючы сябе прыдумляннем больш-менш праўдападобных версій сваёй пастаяннай адсутнасці. А мне... Мне да смерці хацелася закахацца, я не магла жыць паўнацэнным жыццём, не адчуваючы сябе камусьці патрэбнай. І час ад часу ціхенька прасіла ў таго, хто распараджаецца лёсамі і пачуццямі: «Гасподзь, ну пашлі мне хоць каго-небудзь, каб свет не здаваўся такім шэрым!»

Між тым даўно заўважана: калі прасіць аб чым-небудзь вельмі шчыра і вельмі заўзята, то, хутчэй за ўсё, жаданае атрымаеш. Іншая справа, што, можа, не адразу атрымаеш, а крыху пазней (пакуль там, у нябеснай канцылярыі да цябе чарга дойдзе!..) Ты, можа, і забыцца паспееш пра сваё жаданне, а яно — раз! — і спраўдзіцца. І ўжо быццам бы не патрэбна табе тое, без чаго раней жыць не мог, а ўсё роўна будзь ласкавы — вазьмі. Можа, у наступны раз тройчы падумаеш, перш чым заказы наверх пасылаць.

З ДНЯ гэтай сустрэчы маё жыццё перамянілася. Я перастала ратварылася сама меней у багіню. Кожную раніцу Міраслаў (ці проста Слава) адвозіў мяне на працу і кожны вечар адтуль забіраў. Па дарозе, калі ў мяне былі час і жаданне, мы заязджалі кудынебудзь павячэраць — у піцэрыю ці невялікі рэстаранчык. Міраслаў баяўся, што я буду з ім сумаваць, і стараўся забаўляць мяне з усіх сіл. Купляў білеты на канцэрты заезджых «зорак», прывозіў з камандзіровак кнігі навамодных аўтараў, а часам проста вазіў па вячэрнім горадзе, расказваючы цікавыя гісторыі пра вулачкі і завулкі свайго (чаго грахі таіць — далёкага) юнацтва.

Я разумела: ён хоча мяне прыручыць. Паволна і паступова, дзень за днём, крок за крокам запаўняючы сабой маё жыццё, парушаючы мае правілы, навязваючы мне ўласны расклад.

Ён не патрабаваў удзячнасці, хоць відавочна чакаў яе. А я рабіла ўсё для таго, каб адцягнуць момант расплаты. І кожны дзень прачыналася з надзеяй, што, магчыма, сёння ў маім сэрцы праклюнуцца кволыя парасткі закаханасці.

Дарэмна... Сэрца ніяк не хацела рэагаваць на заклікі розуму, а без гэтага маё цела заставалася «мёртвым». Аддanaсць, закаханасць свайго прыяцеля я магла ўсяго толькі ацаніць. Адказаць жа на іх, на жаль, была не ў стане.

Ён успрымаў мае пастаянныя адмовы на дзіва спакойна (уяўляю, чаго яму гэта каштавала). У нашых адносінах нічога не мянялася. Слава служыў мне, як верны васал сваёй гаспадарыні, просячы толькі аб адным — не пакідаць яго, прымаць як данасць, дазваляць яму няньчыцца са мной заўсёды, калі мне гэтага захочацца (у яго ж гэтае жаданне не знікала ніколі).

...АДНОЙЧЫ, калі мы без усялякай мэты блукалі па вуліцы і ён цярпліва тлумачыў мне, як трэба разумець сэнс рамана Маркеса «Сто гадоў адзіноты», у мяне нечакана зламаўся абцас. Нядоўга думаючы, мой спадарожнік падхапіў мяне на рукі і, не звяртаючы ўвагі на здзіўленыя позіркі прахожых, панёс да бліжэйшай майстэрні. Там, аддаўшы боцікі ў тэрміновы рамонт, пасадзіў мяне ў крэсла і ўхутаў ногі сваім шалікам.

Што павінна была зведаць пасля ўсяго гэтага жанчына? Правільна, пачуццё пяшчоты і ўдзячнасці. Я ж адчула толькі віну за тое, што не магу адказаць яму чымсьці падобным. Магчыма, ён памылкова прыняў маю вінаватасць за нешта большае, таму што на вуліцы спыніў таксі і сказаў вадзіцелю свой адрас. Мне ж было няёмка адмаўляцца...

Па сённяшні дзень адганяю ад сябе ўспаміны пра той вечар. Хоць нічога страшнага не адбылося. Ён паставіў на стол вазачку з цукеркамі, адкаркаваў бутэльку марціні. Папрасіў прабачэння, што не падрыхтаваўся па майго візіту па поўнай праграме — так нечакана ўсё атрымалася. Паставіў дыск з неназойлівай музыкай і... пачаў раздзявацца. У гэты кароткі прамежак часу я паспела падумаць пра адну вельмі цікавую рэч. Чаму ў жаночай дылеме — што лепш: кахаць ці быць каханай — заўсёды перамагае жаданне быць каханай? Першы ж псіхатэрапеўт скажа, што гэта сведчыць аб нізкай жаночай самаацэнцы і закамплексаванасці. Ды і з пункту гледжання фізіялогіі пры такой раскладцы вельмі няпроста дайсці да найвышэйшай кропкі самааддачы...

Ці варта казаць, што гэта было наша першае і апошняе блізкае спатканне? Вельмі хутка адносіны — па маёй ініцыятыве — увогуле звяліся да тэлефонных званкоў. Сяброўка спрабавала пераканаць мяне, што, калі б Міраслаў быў Апалонам Бельведэрскім, усё магло б скончыцца не так бяздарна. Маўляў, я не ацаніла яго шырокую натуру, таму што мне была патрэбна прыгожая абалонка.

Вось тут яна якраз памыляецца. Апалон не Апалон... Для закаханай жанчыны яе мужчына — нават самы апошні заморак — лепшы не тое што за Апалона, а нават за акцёра Дамагарава ці таго ж Роберта дэ Ніра. Калі ж не распаліўся ў жаночым сэрцы пажар, тут ужо ніякія формы і канфігурацыі не выратуюць.

І яшчэ. Каханага мужчыны ў нашым жыцці павінна быць роўна столькі, колькі мы самі можам яму дазволіць. І ні ў якім разе не больш. Інакш наступіць стойкая перадазіроўка.

...ЦЯПЕР на маім асабістым фронце ўсё ў поўным парадку! На работу і з работы езджу на грамадскім транспарце, абутак у рамонт нашу сама, за абеды ў кавярні разлічваюся з уласнай кішэні. І паверце, адчуваю сябе абсалютна шчаслівай. Святы ў асабістым жыцці, вядома, здараюцца, але не так часта, каб надакучыць. Зрэшты, гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

**Ала БЫВАЛАВА**

■ З канверта

# «СВАЯЦКІ» ТРОХКУТНІК

«Замуж я вышла, як мне здавалася, па каханні. Муж прывёў мяне ў трохпакаёвую кватэру, дзе, акрамя бацькоў, жыў яшчэ і яго старэйшы брат. Цэлы год усё ішло проста цудоўна, а потым Валеру (мужа) забралі на зборы. Па вечарах я сядзела дома, чытала ці вязала, а потым заходзіла ў пакой да яго брата, каб паглядзець які-небудзь фільм па камп'ютары (уласнага ў нас яшчэ не было).

Алег ласкава называў мяне сястрычкай, цікавіўся справамі на працы ды і ўвогуле давоў карысныя парады. Ён шмат дзе пабываў, многа бачыў, шмат чытаў. Дзяўчаты званілі яму кожны дзень, прыходзілі ў госці, але ніводная не затрымлівалася надоўга. У параўнанні з маім мужам ён здаваўся вельмі дарослым, самастойным. Не браў у бацькоў грошы на цыгарэты, не патураў капрызам маці...

Аднойчы Алег прапанаваў мне схадзіць з ім у кіно — проста так, па-сяброўску. Мы і бацькам пра гэта сказалі — што тут дрэннага? А калі ў зале выключылі святло, ён узяў мяне за руку і дзве гадзіны трымаў яе ў сваёй... Па дарозе дадому мы амаль не размаўлялі...

Калі ішла на вакзал сустракаць мужа — плакала. І потым усё валілася з рук. Трэба было гатаваць святочную вячэру, сядзець побач з Валерам за сталом, усміхацца... А я думала толькі пра адно — як цяпер будзе? Ці зможам мы з Алегам сустракацца па-за межамі дома? Як? Дзе?

З таго часу мінуў год... У нашых з Алегам адносінах нічога не змянілася. Калі ўсе дамашнія вяртаюцца з работы, мы іграем ролю «сваякоў», а як толькі ўсе за парог — кідаемся адно да аднаго ў абдымкі. А Валера ні аб чым не здагадваецца...

Часам мне становіцца брыдка ад самой сябе, ад нашага «сваяцкага» трохвугольніка. Але разарваць адносіны з Алегам не магу — ён стаў для мяне ўсім. Прызнацца мужу — значыць назаўсёды пасеяць паміж імі варожасць і недавер... Што рабіць — не ведаю...»

**Юлія С.**, *г. Гомель*